***Д. Г. Матлахова***
*Навук. кір.* ***Н. П. Цімашэнка,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# СТРУКТУРНА-ГРАМАТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СЛОВАЗЛУЧЭННЯЎ З АЗНАЧАЛЬНЫМІ АДНОСІНАМІ Ў МОВЕ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА

У даследаванні мы звяртаемся да структурна-граматычнай характарыстыкі словазлучэнняў з азначальнымі адносінамі ў мове твораў В. Быкава. Паводле структуры словазлучэнні падзяляюцца на простыя і складаныя. Простымі словазлучэннямі лічацца тыя, што складаюцца з двух самастойных слоў, звязаных паміж сабою адным відам падпарадкавальнай сувязі: дапасаваннем (*новае валадарства* [1, с. 109]), кіраваннем (*развітацца з жыццём* [2, с. 620]) або прымыканнем (*трошкі адарвацца* [1, с. 620]). Да простых таксама адносяць словазлучэнні, у якіх залежны кампанент выражаецца: 1) складанай назвай: *падацца ў Барані Лог* [2, с. 145]; 2) сінтаксічна непадзельным спалучэннем або складанай граматычнай формай: *жаваць поўным ртом* [2, с. 547]. У такіх словазлучэннях залежны кампанент выконвае функцыю аднаго члена сказа.

Мэта работы – вызначэнне асаблівасцей структурна-граматычнай арганізацыі словазлучэнняў з азначальнымі адносінамі. Словазлучэнні, у якіх ролю залежнага слова выконваюць атрыбутыўныя часціны мовы, падзяляюцца на некалькі груп: 1) словазлучэнні з прыметнікамі; 2) словазлучэнні з займеннікамі; 3) словазлучэнні з парадкавымі лічэбнікамі; 4) словазлучэнні з дзеепрыметнікамі. У сінтаксічную сувязь з назоўнікам могуць уступаць прыметнікі розных лексіка-граматычных разрадаў: якасныя (*мокрая трава* [2, с. 376], *прыгожая дзяўчына* [2, с. 64]), адносныя (*каменны калодзеж* [2, с. 563], *гарадскі парк* [2, с. 568]) і прыналежныя (*бацькавы світак* [2, с. 390], *Петраковы плечы* [2, с. 325]. У сэнсава-граматычную сувязь з галоўным словам (назоўнікам) могуць уступаць займеннікі розных семантычных разрадаў: 1) указальныя: *з гэтага канца цэху* [3, с. 30], *у такі час* [3, с. 351]; 2) азначальныя: *сама Сцепаніда* [2, с. 190], *кожны вучань* [3, с. 300]; 3) няпэўныя: *якое-небудзь прыстанішча* [3, с. 451]; 4) адмоўныя: *ніводнае слова* [3, с. 37] і інш. Словазлучэнні з парадкавымі лічэбнікамі ўказваюць на парадак прадметаў, названых галоўным словам, паказваюць на парадкавы нумар аднародных прадметаў пры іх лічэнні: *першая бомба* [2, с. 128], *трэці пакіроўшчык* [2, с. 128]. Словазлучэнні з дзеепрыметнікамі адрозніваюцца ад словазлучэнняў з іншымі атрыбутыўнымі часцінамі мовы тым, што дзеепрыметнікі характарызуюць прадмет па прымеце дзеяння: *падкасаныя рукавы* [3, с. 20].

Такім чынам, разгляд адметнасцей структурна-граматычнай арганізацыі словазлучэнняў з азначальнымі адносінамі ў мове твораў В. Быкава прывёў да высновы, што па структуры словазлучэнні падзяляюцца на простыя і складаныя. У разгледжаных словазлучэннях ролю залежнага кампанента могуць выконваць розныя часціны мовы: прыметнікі, займеннікі, парадкавыя лічэбнікі і дзеепрыметнікі.

## Літаратура

1 Быкаў, Васіль. Пахаджане. Прыпавесці / Васіль Быкаў. – Вільнюс : Наша Ніва, 2000. – 192 с.

2 Быкаў, В. У. Выбраны творы / В. У. Быкаў. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

3 Быкаў, В. Дажыць да світання: аповесці / В. Быкаў. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 494 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ